HUMAN RIGHTS HOUSE FOUNDATION

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка
Канцылярыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Электронная пошта: contact@president.gov.by
Факс: +375 17 226 06 10

Аляксандр Уладзіміравіч Канюк
Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь
Электронная пошта: info@prokuratura.gov.by
Факс: +375 17 226 42 52

24 студзеня 2012

**Заклік да неадкладнага вызвалення і рэабілітацыі Алеся Бяляцкага**

**Асуджэнне Алеся Бяляцкага дэманструе сур'ёзную пагрозу свабодзе аб'яднанняў і свабодзе перакананняў і іх выказвання ў Беларусі.**

**Мы заклікаем беларускія ўлады неадкладна вызваліць і зняць усе абвінавачванні з праваабаронцы Алеся Бяляцкага, цалкам рэабілітаваць яго і забяспечыць бесперашкодную дзейнасць арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія працуюць у галіне правоў чалавека і ў іншых сферах.**

24 студзеня ў выніку разгляду касацыйнай скаргі на вердыкт Першамайскага раённага суда горада Мінска па справе Алеся Бяляцкага, кіраўніка праваабарончага цэнтра "Вясна" ў Беларусі, віцэ-прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) і аднаго з заснавальнікаў Беларускага Дома правоў чалавека ў выгнанні, азначаны вышэй прысуд быў пакінуты ў сіле: 4,5 гады пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Апошні пункт прысуду (канфіскацыя маёмасці) быў вынесены без уліку таго факту, што ўсе падаткі і штрафы, накладзеныя на Алеся Бяляцкага, былі цалкам аплочаны да слухання па касацыйнай скарзе.

4 жніўня 2011 года Алесь Бяляцкі быў арыштаваны ў Мінску. Мы расцэньваем утрыманне пад вартай Алеся Бяляцкага са жніўня 2011 года як прамы вынік яго законнай праваабарончай дзейнасці ў Беларусі.

24 лістапада 2011 года Алесь Бяляцкі быў прысуджаны да 4,5 гадоў турэмнага зняволення з канфіскацыяй маёмасці, у тым ліку ўласнасці, зарэгістраванай на іншых асоб, па абвінавачванні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў.

Сённяшні прысуд з'яўляецца следствам абмежаванняў правоў на свабоду аб'яднанняў і свабоду перакананняў і іх выражэння, уведзеных ў Беларусі. Як і многім НДА ў Беларусі, «Вясне» было неаднаразова адмоўлена ў рэгістрацыі. Гэта адмова была кваліфікавана як неабгрунтаваная Камітэтам па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Такім чынам, Алесь Бяляцкі быў вымушаны праводзіць сваю дзейнасць у галіне правоў чалавека падпольна. Яму не дазволілі ўступіць у аб'яднанне з іншымі людзямі і выказваць свабодна свае перакананні.

Сённяшні прысуд пацвярждае адкрытае парушэнне Дэкларацыі аб праваабаронцах, у прыватнасці, права ажыцяўляць праваабаранчую працу індывідуальна і сумесна з іншымі, права на законнай падставе прафесійна займацца абаронай правоў чалавека, права запытваць,

атрымліваць і выкарыстоўваць рэсурсы ў мэтах абароны правоў чалавека (у тым ліку грашовыя сродкі, якія паступаюць з-за мяжы) [1].

Дзяржавы абавязаны забяспечваць выкананне і прытрымоўвацца ўсіх палажэнняў вышэйзгаданай Дэкларацыі, а таксама прымаць усе неабходныя меры для забеспячэння абароны кожнай асобы ад любой праявы гвалту, пагрозаў, помсты, негатыўнай дыскрымінацыі, ціску або любога іншага адвольнага дзеяння, што ўзнікаюць у выніку законнага выкарыстання правоў, згаданых ў Дэкларацыі.

Алесь Бяляцкі і яго адвакат маюць намер накіраваць наглядную скаргу на імя старшыні Мінскага гарадского суда, а затым – у Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь у вызначаны законам тэрмін.

**Мы заклікаем Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь неадкладна зняць усе абвінавачванні супраць Алеся Бяляцкага. Таксама заклікаем беларускія ўлады цалкам рэабілітаваць Алеся Бяляцкага.** Мы лічым, што беларускія ўлады павінны ўжыць усе неабходныя захады дзеля забеспячэння свабоднай дзейнасці прваабаронцаў без празмерных абмежаванняў, у тым ліку шляхам рэгістрацыі праваабарончых арганізацый, і адмовіцца ад выкарыстання рэгістрацыі НДА ў якасці інструмента для падаўлення крытыкі.

З павагай,

- Армянская Хельсінская асацыяцыя
- Дом правоў чалавека ў Баку
    - Асацыяцыя аховы правоў жанчын імя Д.Аліевай (APWR)
    - Праваабарончы цэнтр Азербайджана (AHRC)
    - Грамадства прававой адукацыі
    - Інстытут правоў СМІ
    - Жаночая асацыяцыя за рацыянальнае развіццё (WARD)
- Беларускі Дом правоў чалавека ў выгнанні (Вільня)
    - Belarus Watch (ByWatch)
    - Беларуская асацыяцыя журналістаў
    - Беларускі Хельсінкскі Камітэт
    - Праваабарончы цэнтр "Вясна"
    - Грамадскае аб'яднанне "Цэнтр "Супольнасць"
- Дом правоў чалавека ў Сараева
    - Асацыяцыя жанчын-грамадзян "Рэнесанс"
    - Фонд CURE
    - Хельсінкскі камітэт па правах чалавека ў Босніі і Герцагавіне
    - Рэгіянальны каардынатар маладзёвых груп
    - Сербскі грамадзянскі рух – Рух за раўнапраўе – Савет Сараева
    - Цэнтр "Жанчына і грамадства"
- Дом правоў чалавека ў Заграбе
    - APEO/UPIM Асацыяцыя па садзейнічанні забеспячэнню роўных магчымасцяў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі

[1] Дэкларацыя аб праве і абавязку асоб, груп і грамадскіх структрураў заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды", A/RES/53/144, 8 сакавіка 1999.



OSLO Kirkegt. 5, 0153 Oslo, Norway | Tel.: +47 22 47 92 47 | Fax: +47 22 47 92 01 | hrh@humanrightshouse.org | Org. no.: 976 055 365 | Account no. (IBAN): NO37 1609 0492 458
GENEVA Rue de Vermont 37-39, PO Box 35, 1211 Geneva 20, Switzerland | Tel.: +41 22 594 38 00 | geneva@humanrightshouse.org | Account no. (IBAN): CH36 0900 0000 1020 3098 5

- B.a.B.e.
- CMS - Цэнтр па вывучэнні праблем міру
- Documenta - Цэнтр Зварот да мінулага
- GOLJP - Грамадзянскі камітэт па правах чалавека
- Svitanje - Асацыяцыя па ахове і ўмацаванню псіхічнага здароўя

• Дом правоў чалавека ў Тбілісі
  - Цэнтр па правах чалавека Грузія (HRIDC)

• Дом правоў чалавека ў Скоп'е
  - Македонскае Аб'яднанне Правоў Жанчын (MWRC) – Цэнтр Прытулку
• Дом правоў чалавека ў Осла
  - Сетка па барацьбе з голадам FoodFirst (FIAN)
  - Інфармацыя аховы здароўя і правоў чалавека
  - Фонд Дамоў правоў чалавека
  - Нарвежскі камітэт у Бірме
  - Нарвежскі Хельсінкскі камітэт
  - Нарвежскі камітэт у Тыбеце

• Фонд па правах чалавека Рафто (Нарвегія)
• Камітэт адвакатаў за правы чалавека YUCOM (Сэрбія)
• Ураінскі Хельсінкскі саюз па правах чалавека
• Артыкул 19 (Вялікабрытанія)
• Індэкс цэнзуры (Вялікабрытанія)

Копіі былі накіраваныя:

- Генеральны дырэктарат па правах чалавека і прававых пытаннях Савета Еўропы, Страсбург
- Упраўленне Камісара па правах чалавека Рады Еўропы, Страсбург
- Спецыяльны дакладчык ААН па становішчы праваабаронцаў, Жэнева
- Спецыяльны дакладчык ААН па заахвочванні і абароне права на свабоду меркаванняў і іх выказвання, Жэнева
- Спецыяльны дакладчык ААН па пытанні незалежнасці суддзяў і адвакатаў, Жэнева
- Спецыяльны дакладчык па пытанні аб катаваннях і іншых жорсткіх, нялюдскіх або прыніжаючых годнасць відах абыходжання і пакарання, Жэнева
- Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ)
- Дэлегацыя Еўрапейскага Саюза ў Рэспубліцы Беларусь
- Падкамітэт па правах чалавека Еўрапейскага парламента, Брусэль
- Нарвежскае міністэрства замежных спраў
- Пастаянны камітэт па замежных справах парламента Нарвегіі
- Пасольства Нарвегіі, Вільня
- Нарвежская дэлегацыя ў АБСЕ
- Швейцарскае Міністэрства замежных спраў
- Прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь пры ААН у Жэневе
- Паўднёвакаўказская сетка праваабаронцаў



OSLO Kirkegt. 5, 0153 Oslo, Norway | Tel.: +47 22 47 92 47 | Fax: +47 22 47 92 01 | hrh@humanrightshouse.org | Org. no.: 976 055 365 | Account no. (IBAN): NO37 1609 0492 458
GENEVA Rue de Vermont 37-39, PO Box 35, 1211 Geneva 20, Switzerland | Tel.: +41 22 594 38 00 | geneva@humanrightshouse.org | Account no. (IBAN): CH36 0900 0000 1020 3098 5

HUMAN RIGHTS HOUSE FOUNDATION

**Аб Сетцы Дамоў правоў чалавека** ([www.humanrightshouse.org](http://www.humanrightshouse.org))
Сетка Дамоў правоў чалавека з’яўляецца форумам супрацоўніцтва паміж існуючымі і новымі Дамамі правоў чалавека. Яна аб'ядноўвае 70 НДА ў 15 краінах Заходніх Балкан, Усходняй Еўропы і Паўднёвага Каўказа, Усходняй Афрыкі і Афрыканскага Рога, а таксама Заходняй Еўропы. Мэтай СДПЧ з’яўляецца абарона, умацоўванне і падтрымка праваабаронцаў і іх арганізацый. Фонд Дамоў правоў чалавека, які базуецца ў Осла (Нарвегія) і Жэневе (Швейцарыя), выконвае функцыі Сакратарыята Сеткі Дамоў правоў чалавека.


OSLO Kirkegt. 5, 0153 Oslo, Norway | Tel.: +47 22 47 92 47 | Fax: +47 22 47 92 01 | hrh@humanrightshouse.org | Org. no.: 976 055 365 | Account no. (IBAN): NO37 1609 0492 458
GENEVA Rue de Vermont 37-39, PO Box 35, 1211 Geneva 20, Switzerland | Tel.: +41 22 594 38 00 | geneva@humanrightshouse.org | Account no. (IBAN): CH36 0900 0000 1020 3098 5